**Водзыў**
**навуковага кіраўніка аб дысертацыі Надзеі Мікалаеўны Палтаржыцкай «Актавыя кнігі менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі інстытута самакіравання Менска», якая прадстаўлена на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання**

Тэма дысертацыйнага даследавання Н.М. Палтаржыцкай была вызначана у адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» і распрацоўвалася ў адпаведнасці з Дзяржаўнымі праграмамі навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» і на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы». Дысертацыя выконвалася ў аддзеле аддзела гісторыі Беларусі IX – XVIII стагоддзяў і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Дысертацыйнае даследаванне Н.М. Палтаржыцкай цалкам адпавядае спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання, а таксама галіне «гістарычныя навукі».

Тэма дысертацыі «Актавыя кнігі менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі інстытута самакіравання Менска» з'яўляецца актуальнай для айчыннай гісторыі. Для беларускай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства дадзеная тэматыка вельмі запатрабавана.

Цікавасць да дзейнасці органаў самакіравання беларускіх гарадоў з'яўляецца стабільнай і запатрабаванай, а разгляд дадзеных пытанняў без гістарычных крыніц уяўляецца немагчымым. У сувязі з чым з'яўляецца важным выяўленне і дасканалае вывучэнне кола крыніц, у якіх можна адшукаць інфармацыю пра склад, структуру, узаемадзеенне, канкрэтныя накірункі дзейнасці органаў самакіравання, як і прадстаўляецца неабходным вызначэнне ступені інфарматыўнасці разнастайных відаў крыніц па адзначанай тэматыцы. Пытанні выяўлення і грунтоўнага аналізу выяўленных крыніц па гісторыі магдэбургскага Мінска з'яўляюцца запатрадаванымі ў гістарычнай навуцы. У дысертацыі на аснове комплекснага аналізу іх дакументаў і запісаў устаноўлена, што кнігі Менскага магістрата з'яўляюцца галоўнай крыніцай для вывучэння гарадского самакіравання другой паловы XVII ст.

У кандыдацкай дысертацыі, падрыхтаванай Н.М. Палтаржыцкай, праведзена комплекснае даследаванне магістрацкіх кніг другой паловы XVII ст. горада Мінска. У працы адлюстравана інфарматыўнасць дадзеных магістрацкіх кніг для даследавання гісторыі гарадского самакіравання Мінска, вызначаны відавы склад дакументаў дадзеных кніг, паказана спецыфіка мінскіх магістрацкіх кніг у залежнасці ад відавага складу. Праца Н.М. Палтаржыцкай з'яўляецца першым, і даволі ўдалым, вырашэннем дадзеных навуковых праблем.

Адзначу, што дысертант падышоў да вырашэнне навуковай праблемы старанна, апантанна і творча. Пры чым, ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі зроблены аналіз мінскіх магістрацкіх кніг другой паловы XVII ст. як крыніц па гісторыі самакіравання горада; праведзена іх кадыкалагічнае апісанне; вызначана крыніцазнаўчая каштоўнасць дакументаў і запісаў магістрацкіх кніг пры даследаванні гарадскога самакіравання; на прыкладзе другой паловы XVII ст. праведзена характарыстыка спецыфікі магістрацкіх кніг паводле ўнесеных у іх дакументаў і запісаў.

Лічу, што наяўнай рэдакцыі у дысертацыі павінна быць зменена назва на «Актавыя кнігі менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада», што больш дакладна адлюстроўвае дасягненні дыссертацыйнага даследавання, так як у працы не закранаецца пытанне функцыянавання мінскага магістрата менавіта як асобнага інстытута ўлады.

Атрыманыя навуковыя вынікі Н.М. Палтаржыцкай з'яўляюцца грунтоўнай базай для далейшага вывучэння гісторыі Беларусі, гісторыі Мінска, гісторыі беларускіх гарадоў, як краязнаўчы матэрыял і для падрыхтоўкі музейных выстаў і экспазіцый, тэкста экскурсій.

Высновы, асноўныя палажэнні, якія выносіць Н.М. Палтаржыцкая на абарону прайшлі першапачатковую апрабацыю, вызначаюцца дакументальнай абгрунтаванасцю і высокай навуковай верагоднасцю. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання, якія змешчаны ў дысертацыі, абмяркоўваліся на 16 навуковых канферэнцыях і круглых сталах. Прычым, дысертант рабіў упор на апрабацыю вынікаў сваіх даследаванняў на спецыялізаваных мерапрыемствах: канферэнцыях «Мінск і мінчане: 10 стагоддзяў гісторыі (да 510–годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права)» (г. Мінск, 4–5 верасня 2009 г.); «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць» (г. Мінск, 15–16 верасня 2011 г.); «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Да 950–годдзя горада» (г. Мінск, 7–8 верасня 2017 г.); IV Міжнародны кангрэс гісторыкаў Беларусі «Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 90–годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)» (г. Мінск, 17–18 кастрычніка 2019 г.); "Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя горада)» (Минск, 9–10 сентября 2022 г.) і інш.

Вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны дастаткова поўна. 16 публікацый саіскальніка адлюстроўваюць асноўны змест і палажэнні дысертацыйнага даследавання. У спіс публікацый саіскальніка ўключаны: 5 артыкулаў ў навуковых часопісах, якія ўваходзяць у Пералік выданняў, зацверджаных ВАК Беларусі, 11 – у зборніках навуковых прац і ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый складае 7,1 друкаваных аркуша.

Змест дысертацыі, яе структура, асноўныя часткі працы, а таксама аўтарэферат выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Беларусі па афармленню дысертацыйных даследаванняў.

Аўтарэферат дысертацыі змяшчае асноўныя вынікі, палажэнні праведзенай навуковай работы і цалкам адпавядае структуры, зместу дысертацыйнага даследавання.

Неабходна адзначыць, што дысертацыйнае даследвнне мае вялікі практычны патэнцыял. Змешчаныя ў дысертацыі факталагічны матэрыял і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, гісторыі беларускіх гарадоў і для падрыхтоўкі музейных выстаў і экспазіцый, тэкстаў экскурсій. Асаблівую цікавасць дысертацыйнае даследаванне ўяўляе для спецыялістаў, якія займаюцца вывучэннем гісторыяй Мінска. Матэрыялы дысертацыі будуць карысны і для архівістаў пры апісанні дакументаў рознай разнавіднасці. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання былі выкарыстаны для падрыхтоўкі экскурсійных маршрутаў па экспазіцыі мінскай гарадской ратушы, а таксама для падрыхтоўкі тэматычных экскурсій па гістарычнаму цэнтру Мінска (акт укаранення ад 17.09.2021 г.), як і выкарыстоўаюцца ў працы Нацыянальнага гістарычнага архіва (акт укаранення ад 19.01.2022 г.).

Дысертацыя складаецца са спіса скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, уводзінаў, агульнай характарыстыкі працы, пяці глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадаткаў. Спіс скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, дадаткі дапамагаюць лепш азнаёміцца з дысертацыяй.

Для рэалізацыі пастаўленых мэты і задач даследавання уведзены ў навуковы зварот комплекс раней неапрацаваных архіўных крыніц.

Даследаванне мае завершаны характар і з'яўляецца самастойнай працай дысертанта. Матэрыялы даследавання выкладзены лагічна, паслядоўна, дастаткова поўна, з неабходнай аргументацыяй. Лічу, што кваліфікацыя саіскальніка адпавядае навуковай ступені кандыдата гістарычных навук.

Абгрунтаванасць і верагоднасць высноў, да якіх прыходзіць у дысертацыйным даследаванні Н.М. Палтаржыцкая, абапіраюцца на агульнанавуковыя прынцыпы і спецыяльныя метады гістарычнага пазнання. Тэарэтычнай і метадалагічнай асновай дысертацыі з'яўляюцца аб'ектыўнасць, гістарызм, сістэмнасць. У працы саіскальнікам адэкватна прымяняюцца аналіз знешняй формы дакумента і аналіз пісьма, фармулярны аналіз. Выкарыстанне разнастайных метадаў гістарычнага пазнання (граматычна-дыпламатычны, гісторыка-юрыдычны, гісторыка-геаграфічны, гісторыка-палітычны, гісторыка-эканамічны, гісторыка-сацыяльны аналіз і інш.) абумовіла высокую доказнасць вынікаў даследавання.

У палажэннях, якія выносяцца на абарону, у абагуленым выглядзе адлюстраваны думкі і высновы, якія вынікаюць з аўтарскага аналізу матэрыяла, выкладзенага ў дысертацыі. Усе чатыры палажэнні ўтрымліваць навуковую каштоўнасць, заснаваны на крыніцазнаўчай базе. Палажэнні і высновы дысертацыйнага даследавання адпавядаюць праблемнаму полю дысератцыйнага даследавання, пастаўленым мэце і задачам. Яны сфармуліраваны карэктна, маюць завершаны характар.

Дысертацыя Н.М. Палтаржыцкай з'яўляецца самастойным кваліфікаваным даследаваннем, утрымлівае новыя навукова абгрунтаваныя

палажэнні, якія вырашаюць важную навуковую задачу ў галіне крыніцазнаўства гісторыі Беларусі.

Лічу, што Н.М. Палтаржыцкай заслугоўвае прысуджэння навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання за:

– першае ў айчыннай гістарыяграфіі комплекснае даследаванне актавых кніг мінскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніц па гісторыі гарадскога самакіравання;
– вызначэнне спецыфікі і дакументальнага складу розных відаў кніг мінскага магістрата другой паловы XVII ст.: кніг запісаў і кніг пратаколаў. Вызначэнне асноўнай мэты вядзення кніг запісаў як вядзенне натарыяльна завераных запісаў дамоваў (актаў куплі-продажу і т.д.) з аб’етамі нерухомай маёмасці мяшчан, у той час як задачай вядзенне кніг пратаколаў было фіксацыя хода дзейнасці пасяджэнняў магістрата па адміністрацыйна-распарадчай, натарыяльнай, прававой і т.д. дзейнасці магістрата.
– правядзенне сістэматызацыі дакументальных крыніц актавых кніг мінскага магістрата другой паловы XVII ст.;
– грунтоўную характарыстыку інфарматыўнасці розных відаў дакументальных крыніц актавых кніг мінскага магістрата другой паловы XVII ст. для даследаванняў гісторыі самакіравання паказ, паказ вялікага інфармацыйнага патэнцыяла вышэйзгаданых крыніц для вывучэння кадравага склада органаў гарадскога самакіравання, гісторыі дзейнасці дадзеных органаў самакіравання.

Лічу, што дысертацыйнае даследаванне Палтаржыцкай Н.М. ў прапанаванай вышэй рэдакцыі «Актавыя кнігі менскага магістрата другой паловы XVII ст. як крыніцы па гісторыі самакіравання горада» цалкам адпавядае патрабаванням, якія прад’яўляюцца да прац для прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Навуковы кіраўнік,
загадчык аддзела аддзела гісторыі
Беларусі IX – XVIII стагоддзяў
і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Б. Доўнар

20.03.2023

Подпіс Доўнара А.Б. сведчу
Вяд. спецыяліст па кадрах
"20" 03 2023